было, і стаў сам рабіць людзей. Так і паявілася нячыстая сіла. Гэта тыя людзі, якіх зрабіў чорт» [10, с. 177, 186].

Итак, нечистая сила (чёрт, сатана, дьявол) является вторичным фактором в процессе мироздания, может лишь не слишком удачно подражать истинному Творцу и – в крайнем случае – несколько подпортить сотворенное, что совершенно соответствует христианским воззрениям о происхождении зла в нашем мире от лукавого.

Таким образом, богомильство эволюционировало от манихейства до средневековой ереси и широко распространилось в Южной Европе – регионе, где феодализм развивался по синтезному пути и где возможной опорой еретиков стало античное наследие. В земли восточных славян богомильство проникло в процессе христианизации Киевской Руси, однако в регионе, где генезис феодализма шел по бессинтезному пути, ересь не нашла себе опоры. Православная духовная традиция подавила прельстительное суесловие еретиков и лишила его изначального смысла, превратив в назидательные сюжеты церковных сочинений и народных космогонических сказаний.

### Список использованных источников


1. Васильев, Л.С. История религий Востока / Л.С. Васильев. – М.: Высшая школа, 1988. – 414 с.
2. Николов, Н. Звездочёты древности / Н. Николов, В. Харлампиев. – М.: Мир, 1991. – 293 с.
3. Ангелов, Д. Богомильство в Болгарии / Д. Ангелов. – М.: Изд-во ин. лит, 1954. – 214 с.
4. Повесть временных лет: Ч. 1. – М. – Л.: Изд-во АН СССР, 1950. – 404 с.
5. Знаменский, П.В. История Русской церкви / П.В. Знаменский. – М.: Крутицкое патриаршье подворье, 1996. – 474 с.
6. Сказание, как сотворил Бог Адама // Памятники литературы Древней Руси. XII век. – М.: Художественная литература, 1980. – 707 с.
7. Того же Кирилла, наставление / Кирилл Туровский. Избранные произведения. Вып. 2.–Гомель:Гомельский научный центр,1999. – 52 с.
8. Легенды і паданні. – Мн.: Навука і тэхніка, 1983. – 543 с.
9. Ненадавец, А.М. За смугою міфа: беларуская міфалогія і дэманалогія / М. Ненадавец. – Мн.: Беларуская навука, 1999. – 254 с.
10. Народная міфалогія Гомельшчыны: фальклорна-этнаграфічны зборнік. – Мн.: ЛМФ «Нёман», 2003. – 320 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*І.В. Глушэц (Гомель)*

## НЕМАТЭРЫЯЛЬНАЯ КУЛЬТУРНАЯ СПАДЧЫНА ТУРАЎШЧЫНЫ ЯК АГУЛЬНАНАЦЫЯНАЛЬНАЯ КАШТОЎНАСЦЬ

Адметная духоўная спадчына вызначае менталітэт народа, адрознівае яго ад іншых і з'яўляецца моцным кансалідуючым фактарам супольнасці, каштоўнасным арыенцірам у працэсе спазнання свету.

Нематэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасцю Рэспублікі Беларусь прызнаныя 7 архаічных і рэдкіх праяў традыцыйнай духоўнай спадчыны Гомельшчыны, з якіх 4 прадстаўляюць Тураўскі рэгіён:

– абрад “Юр’я” (абрад “Тураўскі карагод” на свята “Юр’я”) вёскі Пагост Жыткавіцкага раёна;

– спеўны стыль Тураўскага міжрэчча Прыпяці – Сцвігі (аграгарадок Рычоў Жыткавіцкага раёна);

– мясцовы песенны стыль выканання традыцыйных абрадавых і пазаабрадавых твораў аўтэнтычным фальклорным калектывам “Палескія напевы” вёскі Новае Палессе Лельчыцкага раёна;

– традыцыя пакланення каменным крыжам вёсак Данілевічы і Баравое Лельчыцкага раёна (Каменныя “дзевачкі”).

Кожны пункт гэтага спісу – частка найбагацейшай духоўнай спадчыны Рэспублікі Беларусь, захавальнікамі якой з’яўляюцца простыя вясковыя жыхары. Прапануем агляд гэтых унікальных праяў традыцыйнай культуры Тураўшчыны, зроблены на аснове нашых назіранняў за імі на працягу 2010–2015 гадоў.

Абрад “Юр’я” в. Пагост Жыткавіцкага раёна з’яўляецца жывой формай аднаго з аўтэнтычных абрадаў веснавога цыкла і ўключае ў сябе выдатныя ўзоры старажытных карагодаў і песень, а таксама такіх матэрыяльных праяў рэгіянальнай культуры, як народны касцюм і абрадавы хлеб (каравай). Іншая яго назва – “Тураўскі карагод” – тлумачыцца пашырэннем дадзенай абрадавай практыкі менавіта на тэрыторыі Тураўшчыны. У Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь уключаны першым у краіне сярод нематэрыяльных каштоўнасцей – у 2004 г.

Свята Юр’я (у праваслаўнай хрысціянскай традыцыі – дзень святога Георгія Перамаганосцы) адзначаецца 6 мая і звязана з аглядам азімага жыта, уключае ў сябе шэраг абрадавых дзеянняў, скіраваных на ўрадлівасць зямлі і дабрабыт. Раней асноўнымі ўдзельнікамі абраду былі дзяўчаты, зараз яго захавальнікамі з’яўляюцца сталыя жанчыны, якія ўваходзяць у склад народнага фальклорна-этнаграфічнага калектыву “Міжрэчча” Пагосцкага сельскага клуба. Удзельніцы гурта з’яўляюцца выдатнымі знаўцамі мясцовага фальклору, распарадчыцамі каляндарна-земляробчых і сямейна-бытавых свят і абрадаў, сярод якіх і “Тураўскі карагод”. Да ўдзелу ў абрадах яны прыцягваюць маладзейшыя пакаленні, перадаючы ім традыцыі.

Святкаванне “Юраўскага карагоду” ў Пагосце пачынаецца вырабам абрадавага каравая-“карагода”, які пякуць раніцай святочнага дня. У караваі замацоўваюць упрыгожаныя штучнымі кветкамі, каляровымі стужкамі і барвенкам тры галінкі пладовага дрэва, на кожнай з якіх павінна быць па 3 парасткі. Таксама з барвенку робяць вянкі дзяўчатам. Упрыгожаны каравай даюць самаму паважанаму мужчыне – звычайна старшыні сельскага савета, які павінен узвышаць яго, паказваючы сваю пашану караваю і дэманструючы яго ўсім прысутным. Усе дзеянні адбываюцца пад адпаведныя моманту абраду спевы.

Калі каравай выносяць з хаты, да гурта далучаюцца мужчыны, якія нясуць абраз Божай Маці, граблі з начэпленым зялёным фартухом і зорку. Са двара ўсе выходзяць праз “вароты” – 2 рушнікі, што трымаюцца дзяўчатамі. Удзельнікі шэсця накіроўваюцца да жытнёвага поля, на якое ўваходзяць праз рушніковыя “вароты” (выхад з поля адбываецца такім жа чынам). На полі прыносяць ахвяру зямлі – закопваюць кавалак жытняга хлеба, потым водзяць карагоды, просячы ў Бога бласлаўлення “на буйнае жыта, на цёплае лета”, у цэнтры карагоднага кола пры гэтым знаходзяцца мужчыны, якія трымаюць абраз, граблі, зорку і каравай. Далей зялёны фартух на граблях замяняюць на чырвоны, чым даюць знак, што жыта гатовае да росту і паспявання.

Гурт вяртаецца ў вёску, каб з карагодамі і пажаданнямі аднавяскоўцам здароўя, ураджаю і дабрабыту абысці двары. Гаспадары за такія пажаданні абдорваюць гурт цотнай колькасцю яек, хлебам, кілбасамі, гарэлкай, грашыма. Заключны этап свята

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

праходзіць каля клуба – гэта веснавыя карагоды, гульні і танцы, якія доўжацца да позняга вечара.

Да тэрыторыі сучаснага Жыткавіцкага раёна належыць таксама спеўны стыль Тураўскага міжрэчча Прыпяці – Сцвігі, які прэзентуецца песнямі аграгарадка Рычоў і з'яўляецца адным з лакальных песенных стыляў арэала Цэнтральнага Беларускага Палесся. Рэкамендаваны для ўключэння ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь Беларускай рэспубліканскай навукова-метадычнай радай па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны пры Міністэрстве культуры Рэспублікі Беларусь у 2014 г. Носьбіты спеўнага стылю – рычоўцы старэйшага і сярэдняга пакаленняў, а папулярызуюць яго сваёй дзейнасцю ўдзельнікі народнага фальклорнага ансамбля "Дубравіца" мясцовага цэнтра традыцыйнай культуры.

Рычоўскія песні выконваюцца ў час разнастайных свят (у тым ліку шчадраванні на Стары Новы год, вяселлі), традыцыйных "бясед", а таксама на канцэртных выступленнях ансамбля "Дубравіца". Акрамя каляндарна-земляробчых песень (калядных, веснавых загукальных і карагодных), надзвычай багата прадстаўлены вясельныя песні, у тым ліку каравайныя.

У традыцыйным аднагалоссі з элементамі гетэрафоніі спяваюцца каляндарна-абрадавыя, вясельныя і "лесавыя" песні. Апошнія выконваюць, калі ідуць у лес збіраць грыбы і ягады, калі грабуць сена, а іх сюжэты блізкія іншым пазаабрадавым песням – гэта песні пра каханне, цяжкае жыццё замужняй жанчыны ўдалечыні ад родных. Напевы характарызуюцца невялікім дыяпазонам, свабодай метрарытмічнай будовы, доўгімі фермата ў канцы строф. Пазаабрадавыя песні ў натуральным бытаванні часта выконваюцца  ў застоллі, таму і вызначаюцца як "застольныя". Імі прадстаўленыя спевы з падводкай – верхнім саліруючым голасам. Гэты стыль адносіцца да поліфанійных і з'яўляецца адным з самых складаных, што існуюць у беларускай спеўнай традыцыі. Ён характэрны для Палесся, а ў сваіх самых развітых формах – менавіта для цэнтральнай яго часткі.

Асаблівасцю рычоўскіх спеваў з'яўляецца захаванне традыцыі мужчынскага выканальніцтва: мужчыны спяваюць як разам з жанчынамі, так і асобна.

Працягу дадзенай традыцыі садзейнічае дзіцячы вакальны калектыў «Усмешка», які адносіцца да Рычоўскага цэнтра традыцыйнай культуры і з'яўляецца спадарожнікам ансамбля «Дубравіца».

Наступныя праявы духоўнай спадчыны Тураўшчыны, якія знаходзяцца пад дзяржаўнай аховай, прадстаўляюць тэрыторыю сучаснага Лельчыцкага раёна.

Носьбітам мясцовага песеннага стылю выканання традыцыйных абрадавых і пазаабрадавых твораў вёскі Новае Палессе, уключанага ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь у 2009 г., з'яўляецца народны фальклорны калектыў "Палескія напевы" мясцовага сельскага клуба.

Традыцыйная народная культура вёскі Новае Палессе належыць басейну рэк Сцвігі і Убарці. Мясцовая песенная культура вылучаецца захаванасцю найбольш старажытнага пласта – абрадавых песень (веснавых, у тым ліку карагодных, жніўных, вясельных) і песень раннетрадыцыйнай пазабрадавай лірыкі. Выкананне такіх песень патрабуе валодання разнастайнымі манерамі і тэхнікамі ў залежнасці ад жанра песні. Найбольш складаным і спецыфічным выканальніцкім стылем, якім валодаюць спявачкі з Новага Палесся, з'яў-ляецца імправізацыйны, прадстаўлены жніўнымі і раннетрадыцыйнымі лірычнымі песнямі.

Фальклорны калектыў "Палескія напевы" быў створаны ў 2000 г. з мэтай падтрымаць багаты пласт духоўнай народнай культуры. З 2005 г. ён мае ганаровае найменне "Народны аматарскі калектыў". Яго дзейнасць накіравана на збор, адраджэнне і папулярызацыю мясцовай традыцыйнай спадчыны, яе трансляцыю малодшым пакаленням. Удзельнікі калектыву аднаўляюць каляндарна-земляробчыя і сямейна-абрадавыя святы і звычаі: свята

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Стрэчання, абрады "Ваджэнне Маі" на Тройцу, "Абракальны рушнік" (сямейна-бытавы) і іншыя. Касцюмы зроблены ўдзельніцамі калектыву па мясцовых канонах.

Народны фальклорны калектыў "Палескія напевы" выступае з канцэртнымі праграмамі, праводзіць абрады ў Новым Палессі і паказвае іх у суседніх вёсках, прымае актыўны ўдзел у раённых, абласных, рэспубліканскіх мерапрыемствах.

Наступная духоўная практыка – традыцыя пакланення каменным крыжам вёсак Данілевічы і Баравое Лельчыцкага раёна – рэкамендавана для ўключэння ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь у 2013 г. Яна належыць да так званых аброчных рытуалаў, якія здзяйсняюцца шляхам прынясення аброку сакральным месцам ці аб'ектам, у дадзеным выпадку – каменным крыжам.

Гісторыю гэтых каменных крыжоў расказвае мясцовая легенда, што на працягу доўгага часу перадаецца ад пакалення да пакалення. Раней на месцах, дзе сёння знаходзяцца каменныя "дзевачкі", былі палі, на якіх разам з дарослымі працавалі і дзеці. Адна жанчына са сваёй дачкой-падлеткам Евай (ці Ленай, Марыяй) жала жыта. Раптам на небе з'явілася вялікая чорная хмара. На матчын загад хутчэй збіраць снапы дзяўчынка адказала, што вельмі стамілася. Тады маці ў гневе крыкнула: "А каб ты каменем стала!" У той жа час грымнуў гром і бліснула маланка, а калі неба праяснілася, жанчына ўбачыла, што на тым месцы, дзе была яе дачка, стаіць камень.

Мясцовыя жыхары шануюць гэтыя камяні, турбуюцца пра іх, як пра жывых дзяўчынак, ахоўваюць, прыбіраюць і шчыра вераць у іх звышнатуральную сілу. У якасці аброку ім аддаюць рушнікі, хусткі, самаробныя фартушкі, упрыгажэнні, кветкі, пачастункі, грошы і г.д. Пакідаючы аброк, людзі просяць у камянёў здароўя, шчасця, дабрабыту для сябе і сваіх блізкіх. Напярэдадні Вялікадня камяні "пераапранаюць": здымаюць і спальваюць старое "адзенне", пакідаючы на велікодную ноч мінімум яго, а раніцай святочнага дня прыносяць новыя аброкі. Ля камянёў моляцца, спяваюць праваслаўныя псальмы, а таксама (у Баравым) народныя духоўныя вершы.

Самім характарам гэтая традыцыя садзейнічае захаванню сакральнасці, ужо практычна страчанай у многіх іншых рытуальных дзеяннях. Цудадзейныя магчымасці каменных "дзевачак" прыцягваюць увагу людзей з розных куткоў Беларусі і блізкага замежжа, якія прыязджаюць да крыжоў, каб папрасіць аб самым патаемным.

Як вынікае з праведзенага агляду, кожная з пералічаных праяў нематэрыяльнай культурнай спадчыны Тураўшчыны з'яўляецца адметнай духоўнай практыкай, дасканалым увасабленнем традыцыйнай народнай мастацкай культуры. Іх носьбіты паважліва ставяцца да зберажэння і трансляцыі сваіх традыцый, усімі сіламі спрыяюць іх захаванню і лічаць іх сваім сапраўдным духоўным скарбам. А падтрымка рэгіянальнай духоўнай спадчыны на агульнанацыянальным узроўні садзейнічае развіццю нацыянальнай самасвядомасці, у першую чаргу ў дзяцей і моладзі, і ўмацаванню нацыянальнай бяспекі.

***В.Р. Зямлянік (Тураў)***

## ДУХОЎНА-КУЛЬТУРНАЯ СПАДЧЫНА ТУРАЎШЧЫНЫ. АБРАДЫ ЗЯМЛІ ТУРАЎСКАЙ

Традыцыйная культура мае найважнейшае значэнне для захавання самабытнасці і духоўнай устойлівасці нацыі, яе жыццяздольнасці. Захаванне фальклора, традыцыйных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ